**ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ**

"Унікум" — гэта размовы з цікавымі людзьмі, якія праславіліся ў нейкай сферы. Асобы з унікальным вопытам раскажуць пра сваю дзейнасць, паразважаюць на актуальныя для грамадства тэмы і прыадчыняць дзверы ў свой унутраны свет

# АД ДУДЫ ДА СКРЫПКІ

## ЯКІМІ САКРЭТАМІ ВАЛОДАЕ МУЗЫЧНЫХ СПРАЎ МАЙСТАР



Фота аўтара

**Аляксандра Сурбу ведаюць у першую чаргу як майстра і папулярызатара дуды. Вывучэннем і вырабам гэтага духавога інструмента ён займаецца больш за дзесяць гадоў. Па тэме беларускай дуды нават абараніў дысертацыю. А нядаўна Аляксандр прадставіў сваю першую скрыпку. Выклік вырабіць беларускую "гварнеры" майстар атрымаў ад самога Прэзідэнта падчас вясновай сустрэчы з творчай моладдзю, калі было пастаўлена пытанне пра аднаўленне вытворчасці айчынных музычных інструментаў. Брацца за няпростыя задачы і вучыцца новаму — у духу кандыдата мастацтвазнаўства, а з нядаўняга часу і дэкана факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў**

**— Аляксандр, першыя звесткі пра беларускія музычныя інструменты знаходзім у летапісах часоў Сярэдневякоўя. Можна казаць, што даручэнне Прэзідэнта па стварэнні айчынных музычных інструментаў — у духу традыцый?**

— Сапраўды, музычныя інструменты суправаджалі ўсе святы і відовішчы беларусаў. Гэта быў неад'емны атрыбут усіх мерапрыемстваў. Народныя дуды, цымбалы, скрыпкі выраблялiся асобнымі майстрамі, акадэмічныя інструменты, да якіх адносяцца і скрыпкі, і віолы, і лютні, — спецыяльнымі мануфактурамі. Можна прывесці да прыкладу майстэрню Бальтазара Данкварта XVII стагоддзя, чые інструменты былі вядомыя па ўсёй Еўропе. Новая хваля ўвагі да музычных інструментаў — безумоўна, пазітыўны трэнд. Яна накіравана на тое, каб аб'яднаць майстроў, якія ёсць у нашай рэспубліцы па розных інструментах, матываваць, дапамагчы ім у рэалізацыі прадукцыі. Але галоўнае — захаваць школу вырабу акадэмічных і народных музычных інструментаў, набраць вучняў, якія працягвалі б гэту справу. Сёння нават не ўсе ведаюць, што ў краіне ёсць майстры, якія вырабляюць тыя ці іншыя музычныя інструменты. Да прыкладу, лютні — досыць рэдкі сёння рэнесансна-барочны інструмент. А між іншым Юрый Дубнавіцкі вырабляе іх у Пінску з пачатку 1990-х гадоў.

**— І ў якім кірунку, на ваш погляд, нам варта рухацца? Падтрымліваць індывідуальных майстроў ці развіваць прамысловасць?**

— Усё залежыць ад тых аб'ёмаў, якія будуць планавацца Міністэрствам культуры. Вядома, усе інструменты патрабуюць пільнай працы майстра. Але некаторыя могуць вырабляцца і масава. Як піяніна, да прыкладу. Сёння існуе вялікая патрэба ў гэтым інструменце. Што датычыцца гітар, ёсць высокапрафесійны майстар Андрэй Кібінь з Гродна, які арганізаваў невялікую мануфактуру па вырабе гэтага інструмента. Яго гітары маюць сапраўды высокі агульнаеўрапейскі ўзровень. І галоўнае, Андрэй з задавальненнем навучае гэтай справе іншых. Лічу, вельмі важна падтрымаць вось такіх майстроў, якія не замыкаюцца на сабе, не трымаюць усё ў сакрэце, дзеляцца сваімі ведамі з іншымі.

**— Навучыць вырабу музычных інструментаў можна любога? Ці без пэўнай унутранай патрэбы чалавек не здолее засвоіць гэту тэхналогію?**

— Выраб інструментаў — адна з формаў рэалізацыі чалавечага патэнцыялу. І калі чалавек адчувае патрэбу ў рэалізацыі, то ён заўсёды будзе шукаць справу, якая будзе ў поўнай меры яго раскрываць. Мне падаецца, людзей, якія маглі б займацца вырабам інструментаў, вельмі шмат. Другая справа, не заўсёды ў іх ёсць магчымасць знайсці настаўніка, майстра. Мне ў свой час пашчасціла. Калі зразумеў, што хачу вырабляць музычныя інструменты, звярнуўся да майстра Алеся Уладзіміравіча Ліся, які з задавальненнем узяў мяне ў вучні і паказаў усё, што ведаў, не хаваючы ніякіх сакрэтаў. Вельмі ўдзячны яму. І калі да мяне прыйдуць вучні, буду шчыра радавацца, калі мой вучань пойдзе далей, чым я. Гэта самая лепшая пахвала настаўніку, які перадае вучню свае веды, а той у сваю чаргу ўдасканальвае тэхналогію, прыўносіць нешта сваё. І калі ёсць такі ланцужок перадачы ведаў, то з цягам часу, можа, праз стагоддзі, тэхналогія дасягае свайго ідэальнага стану. Так было са скрыпкамі. Ведаем, што ўжо 400 гадоў яны вырабляюцца амаль па нязменнай класічнай тэхналогіі, якая была яшчэ пры Страдзівары, вучні Амаці.

**— І такі шлях удасканалення перажывае беларуская дуда, якой вы займаецеся больш за дзесяць гадоў...**

— Дударская традыцыя, на жаль, спынілася ў сярэдзіне XX стагоддзя. І толькі ў пачатку 1980-х гадоў пачала сваё адраджэнне. На шчасце, сёння мы маем ужо тры пакаленні майстроў, якія займаюцца вырабам дуд. У кожнага свае падыходы і сакрэты, але ў цэлым, мне падаецца, нарадзілася новая дударская традыцыя.

**— Узяцца за скрыпку падштурхнула менавіта сустрэча з творчай моладдзю ці і раней былі такія задумкі?**

— Некалькі гадоў таму ў мяне ўзнікла ідэя зрабіць струнны інструмент. Разам з яшчэ адным маладым майстрам Цімафеем Палуніным вырабілі дзве скрыпкі-даўбанкі. Гэта спрошчаны народны варыянт скрыпкі з суцэльнага кавалка дрэва, без якой у свой час не абыходзіўся ні адзін кірмаш, як, дарэчы, і без дуды. Быў такі эксперымент. Але рабіць скрыпку акадэмічную па крэмонскай класічнай тэхналогіі з тонкімі і дакладнымі дэталямі, з абавязковым захаваннем профіляў, выгібаў было страшнавата. Аднак паколькі на сустрэчы з моладдзю Прэзідэнт даў такое даручэнне, то трэба было выконваць. Правялі кансультацыю з рэктарам Алінай Анатольеўнай Корбут. Я склаў план, які яна падтрымала, і ўзяўся за працу. Чытаў літаратуру, кансультаваўся са знаёмымі майстрамі, ездзіў у камандзіроўку ў Пінск — нашу беларускую Крэмону. Там сапраўды вельмі шмат майстроў, якія робяць і цымбалы, і віолы, і калёсныя ліры, і клавесіны, і лютні... Калегі падзяліліся і вопытам, і матэрыяламі. Асабліва ўдзячны Андрэю Шклёдзе — выдатнаму майстру шырокага профілю па рэнесансных і барочных інструментах. Пачаў рабіць. Не хачу сказаць, што было лёгка, нават фізічна складана — прыходзілася працаваць па дзесяць гадзін у дзень, здымаць маленькую стружачку па паўміліметра, каб зрабіць усё дакладна. Але, калі ёсць добры настаўнік і дарадчык, можна зрабіць любую справу. Тым больш што вопыт вырабу музычных інструментаў у мяне быў. Праз паўтара месяца скрыпка была гатова. Праўда, інструмент яшчэ павінен выспець. Патрэбны 2—3 гады пастаяннага грання на скрыпцы, каб яна загучала па-сапраўднаму.

**Хваля цікавасці да айчынных музычных інструментаў дакладна будзе спрыяць і захаванню інструментальных традыцый, і развіццю выканальніцкай школы**

**— Што далей? Наступныя скрыпкі, а, можа, і зусім новы інструмент?**

— Скрыпка была выраблена як навукова-практычны інструмент. Мая місія ў гэтай справе — навучыцца рабіць гэты інструмент. Зараз ідзе абмеркаванне пытання, каб аб'яднаць майстроў, якія вырабляюць скрыпкі, у нейкую арцель. Бо пакуль усе працуюць разрознена, няма ярка выражанай школы і адпаведна вучняў. З верасня прыступіў да абавязкаў дэкана факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва. І з гэтай нагоды не так шмат часу займацца інструментамі. Але ёсць пэўны азарт, і думаю ў час летняга адпачынку заняцца новым праектам. А яшчэ хочацца паспрабаваць усё, што робіцца на нашым факультэце, сваімі рукамі. Мне вельмі падабаюцца такія вырабы — у іх ёсць душа, яны валодаюць пэўнай энергетыкай. На мой погляд, вельмі важны ў наш час інфарматызацыі і глабалізацыі зварот да традыцыйных рамёстваў. Гэта натуральная цяга чалавека ўмець нешта рабіць, гэта праца, якая мае сэнс, гэта сувязь з пакаленнямі.

Людміла Мінкевіч
mila@sb.by

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ